УСЁ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

Карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі — з Сочы

«... І НАРВЕГІЯ З РАГАМІ. КРУГОМ!»

Фраза, якую кінуў камусьці ў тэлефонную трубку вядомы каментатар тэлеканала «Расія» Дзмітрый Губерніеў, праходзячы міма. Вядома, нічога крыўднага для краіны, што мяжуе з Палярным кругам, журналіст не сказаў. Наадварот: ён меў на ўвазе шматлікіх нарвежскіх балельшчыкаў, нашчадкаў грозных вікінгаў, якія радаваліся, як дзеці, у сваіх «рагатых» масках, размаляваных у нацыянальныя чырвона-сінія колеры. Увесь лыжна-біятлонны стадыён «Лаура» (вышыня над узроўнем мора 1470 м) да глыбокай ночы стаяў, як кажуць, «на вушах».

Яшчэ б! Радавацца ў іх была нагода, і не адна. Ужо ў суботу, у першы дзень медальных спаборніцтваў, скандынавы захапілі лідарства ў медальным заліку — адразу 4 узнагароды (2 «золаты», «серабро» і «бронза»). Спачатку лыжніца **Марыт Б'ерген** першынствавала ў скіятлоне. Яна апярэдзіла ўсіх на дыстанцыі 15 кіламетраў (7,5 км класічным стылем + 7,5 — свабодным, або «каньковым»). І гэта ўжо чацвёртае алімпійскае «золата» ў кар'еры 33-гадовай спартсменкі.

А затым адбылася проста неверагодная гісторыя: 40-гадовы біятланіст **Уле-Айнар Б'ёрндален** папоўніў сваю калекцыю ўзнагарод, выйграўшы сёмы залаты медаль Алімпійскіх гульняў (першае «золата» нарвежац узяў яшчэ ў японскім Нагана ў далёкім ужо 1998-м). Найлепшы біятланіст у сусветнай гісторыі (яго ўжо сёння, яшчэ дзеючага спартсмена, называюць так) з адным промахам фінішаваў у спрынтарскай гонцы на першым месцы.

«Былі сумненні, — сказаў ён адразу пасля фінішу. — Але, напэўна, я змог сканцэнтравацца своечасова, змог вытрымаць тэмп і хуткасць да апошняга круга на гэтай самай складанай трасе з усіх, дзе мне давялося выступаць». Нарвежац адзначыў, што адчувае сябе поўным сіл, нягледзячы на ўзрост: «Здавацца не збіраюся, буду змагацца і далей. За спінай у мяне — добрая падтрымка таварышаў, выдатная матывацыя. Адсюль і вынік».

А як на гэтым фоне нашы? У суботу ўся пяцёрка, якая брала ўдзел у стартах, была далёкая ад п'едэстала. Спачатку няўдала выступіла лыжніца Алена Саннікава, яна заняла ў згаданым ужо скіятлоне 53-е месца з 62 удзельніц. Праўда, сама спартсменка не выглядала засмучанай. Вашаму карэспандэнту ў мікст-зоне (спецыяльнае месца, дзе алімпійцы маюць права даваць інтэрв'ю. — **Аўт.**) яна, між тым, адзначыла: *«Я прайграла ўсім саперніцам, у якіх раней выйгравала — па паўхвіліны ці нават па цэлай хвіліне. Не ведаю, з чым гэта звязана... Можа, з тым, што у нас дома да сярэдзіны студзеня не было снегу і мы доўга не стартавалі. Наступныя гонкі будуць абавязкова лепшымі. Скіятлон — не апошняя дысцыпліна, і нават не асноўная, дзе я змагу паказаць усё, на што здольная. Вельмі спадзяюся на 10-кіламетровую гонку класічным стылем і «трыццатку» каньковым».*

Алена таксама сказала, што беларускія лыжнікі не маюць у Сочы ніякіх праблем. *«Усе нашы службы забеспячэння, сэрвісмены, урачы, масажысты працуюць выдатна, таму і ўражанні пазітыўныя. А яшчэ хацелася б адзначыць, што мясцовая публіка вельмі прыязна ставіцца да беларускіх спартсменаў, падтрымлівае іх падчас стартаў. Гэта таксама дае сілы».*

Сіл, дарэчы, не хапіла і чацвёрцы нашых біятланістаў: Уладзімір Чапелін у спрынце — 29-ы, Сяргей Новікаў — 33-і, Яўген Абраменка — 56-ы, Юрый Лядаў — 57-ы (усяго

Джоні Куін: «Я быў вымушаны выкарыстаць бабслейны штурхач, каб выбіць дзверы і трапіць на волю».

на спрынт выйшла 87 біятланістаў). Крыху радуе, што беларусы змогуць пазмагацца ў гонцы праследавання.

«Гонка праследавання ў мяне — самая любімая, — распавёў Уладзімір Чапелін. — Не магу падвесці балельшчыкаў. Перад Алімпіядай для нас было зроблена ўсё неабходнае. Гэта мой дэбют на Алімпійскіх гульнях, і мне вельмі хочацца, каб ён запомніўся не толькі першымі стартамі, але і паспяховым выступленнем. Першыя хваляванні пройдуць, так што ўся барацьба — наперадзе!».

«ГЭТА БЫЛА ТРЭНІРОЎКА...»

Так ацаніла сваё выступленне лідар нашай біятлоннай каманды Дар'я Домрачава, якая ў нядзелю вечарам не змагла ўвайсці ў лік медалістаў у спрынтарскай гонцы на 7,5 кіламетра. Першы стрэл — у «малако». І, хоць астатнія мішэні Дар'я закрыла, той промах стаў фатальным: толькі дзявятае месца.

Так склалася, што пасля гонкі я спускаўся па канатнай дарозе, седзячы ў адной кабінцы з Дар'яй. Была яшчэ пара валанцёраў-расіян, і таму ў іх прысутнасці наша галоўная медальная алімпійская надзея была нешматслоўнай. Але сказала, што не расчаравана няўдачай.

— Аптымізму не губляю. Наперадзе мая любімая дысцыпліна — гонка праследавання. Затым — індывідуальная гонка. Там будзе ўсё па-іншаму. Сёння медаль у мяне адабраў парыў ветру: ён нечакана змяніў напрамак — якраз у момант першага выстралу. Зрабіла папраўку, і далей пайшло нармальна.

— Усе скардзяцца на складаную трасу...

— Гэта праўда. Тут жа, па сутнасці, сярэднягор'е, недахоп кісларода адчуваецца. Акрамя таго — нізкая вільготнасць паветра. Ну і траса вельмі няпростая. Пастаянныя пад'ёмы-спускі, крутыя віражы, калі думаеш: толькі б упісацца ў паварот. Упадзеш — усё... Нервы таксама трэба мець жалезныя, а мы ж усяго толькі людзі.

Нічога тут не дабавіш. Як склалася — так склалася. Забыцца пра першую няўдачу і рыхтавацца да новых гонак. Тым больш што ўсе ўмовы для гэтага ёсць.

Застаецца дадаць, што астатнія тры нашы біятланісткі выступілі наступным чынам: Надзея Скардзіна была 17-й, Настасся Дубарэзава — 34-я, Людміла Калінчык — 37-я (з 84 удзельніц). І Надзея, і Людміла пасля гонкі былі настроены аптымістычна, а вось **Насця Дубарэзава** не ўтойвала слёз у мікст-зоне: *«Спадзявалася, што будзе лепш. Цяжка было бегчы».*

Цяжка было ўсім. Тут усё залежыць ад многіх фактараў — як складуцца абставіны. У нядзелю яны склаліся выдатна для расійскай «славачкі» Анастасіі Кузьміной, расіянкі Вольгі Вілухінай, украінкі Віты Семярэнка, якія ўзышлі на п'едэстал.

Вось хто змагаецца ў Сочы па-сур'ёзнаму, дык гэта амерыканцы. Першым чэмпіёнам сёлетняй Алімпіяды стаў менавіта заакіянскі спарстмен: сноўбардыст **Сэйдж Котсенбург** атрымаў перамогу ў мужчынскіх спаборніцтвах па слоўпстайле.

А вось яго суайчыннику, бабслеісту **Джоні Куіну**, паспяхова выступіць перашкодзіла... нечаканасць. «Я прыняў душ, а калі сабраўся выйсці з ваннай, то ўбачыў, што дзверы замкнёныя. Таму быў вымушаны выкарыстаць бабслейны штурхач, каб выбіць дзверы і трапіць на волю», — напісаў Куін у Твітары.

Застаюцца пытанні. Чаму містар Куін пайшоў у ванную са штурхачом? Можа, што-небудзь ці хто-небудзь вырашыў сарваць планы амерыканца па заваяванні медаля? Ці, напалоханы празмернымі мерамі бяспекі, ён вырашыў, што ў выпадку чаго і штурхачы спатрэбяцца?

Дарэчы,

ПРА БЯСПЕКУ

Гэта мы адчулі адразу, калі самалёт з беларускай дэлегацыяй на борце яшчэ толькі прызямляўся ў аэрапорце Адлера. З ілюмінатара было добра відаць, як праз кожную сотню метраў уздоўж перыметра агароджы расстаўлены паліцэйскія і армейскія патрулі. З сабакамі і без, у машынах і без іх. Намаганні па забеспячэнні бяспекі Алімпіяды і перад яе пачаткам і асабліва цяпер былі сканцэнтраваны менавіта на авіярэйсах. Вось адна з прычын гэтага. Улады ЗША папярэджвалі кампаніі ўсяго свету аб магчымасці праносу ўзрыўчаткі на борт самалётаў нават у цюбіках ад зубной пасты. Таму расійскімі ўладамі было забаронена пасажырам самалётаў праносіць на борт любыя вадкасці, гелі ці пасты, нават у ёмістасцях да 100 мл, якія ў іншых краінах дазволены.

Алімпійскі парк ахоўваецца таксама выключна строга. Над лыжным стадыёнам «Лаура» пастаянна кружыцца верталёт, вісіць пара дырыжабляў. Відаць па ўсім, сканіруюць тэрыторыю. Зусім блізка — праблемныя расійскія раёны. Паўночны Каўказ. Мясцовыя калегі кажуць, што на вяршынях гор, якія акружаюць Алімпійскі парк, устаноўлены батарэі зенітных ракет. Усе лясы, якія прылягаюць да дарог, што вядуць да спартыўных аб'ектаў, кругласутачна патрулююць. Паліцыя ў магазінах, банках, кавярнях. Яна ветлівая, але строгая. (Карэспандэнт «Звязды» ў іх чамусьці карыстаецца даверам. Наогул да беларусаў стаўленне тут вельмі добрае)... Гэта — што датычыць быту. Але варта трапіць на сам спартыўны аб'ект — усё выглядае як звычайнае спартыўнае мерапрыемства.

Як свята!

«БУДЗЕ ПЕСНЯ ЗВІНЕЦЬ ЖАЎРУКОМ»

Вясна і каханне ў творчасці паэта-змагара Валянціна Паўлавіча Таўлая, якому 8 лютага споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння

Лявон Целеш, г. Дзяржынск.

Па гарызанталі: 1. «Адчыняйце ..., людзі!\\-Вясна будзе! Вясна будзе!». З верша паэта, крытыка, публіцыста, перакладчыка, нарысіста, ураджэнца г. Баранавічы Валянціна Таўлая. **3.** «Будзе ... звінець жаўруком, пралятаючы далеч». З верша паэта «Таварышу маёй вясны». **6.** «Не даклічацца ніякая ...,\\голас расплывецца ў чыстым полі». З верша «Гэта ўсё — знаёмыя шляхі». **10.** Беларуская сялянска-рабочая ... Арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі, у якую ўваходзіла ўся сям'я паэта, за што падвяргалася ганенню польскімі ўладамі. **12.** Спецыяльная вайсковая група. **13.** ... Антонаўна. Імя маці паэта, якая памерла, калі ён быў зусім яшчэ малы. **16.** «І пазналі яе, залатую вясну,\\ аж заныла ад радасці даўнія ...». З верша «Ранак перамогі». **17.** «Наша ... — бярозавік весні,\\Аксаміт жаўруковае песні». З верша Я. Золака «Наша ...».**19.** Устрыманне ад скаромнай ежы. **20.** Горад на Гродзеншчыне, дзе В.Таўлай працаваў у раённай газеце «Уперад»; у гэтым горадзе, як і ў Баранавічах, Маладзечне, Гродне, Слоніме, імя паэта носяць вуліцы. **22.** Высокая елка. **23.** Жыццеапісанне святых. **24.** ..., незалежнасць. Тое, за што змагаўся патрыёт сваёй Радзімы В.Таўлай — актыўны ўдзельнік нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі і ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. **30.** ... — каровіна свята. Прысвятак, які беларусы-каталікі адзначаюць 5 лютага, а — праваслаўныя — 18 лютага. **31.** «Не задрэмле, не засне\\Партызанскі ...». З верша В.Таўлая «Хлопцы». **32.** «... і краты». Першая кніга паэта, якая выйшла пасля яго смерці, у 1947 годзе.

Па вертыкалі: 1. Паўлюк... Адзін з псеўданімаў В.Таўлая. **2.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца. **3.** У некаторых краінах тытул вышэйшага дваранства. **4.** На Уласа (24 лютага) ... маразоў: тры да Уласа, адзін на Уласа і тры пасля Уласа. **5.** Англійская адзінка даўжыні. **7.** Грашовая адзінка Францыі. **8.** Птушаня арла. **9.** Верш В.Таўлая, прысвечаны памяці Я.Купалы, які быў для яго самым любімым паэтам. **11.** Той, хто збірае весткі аб праціўніку; ім, а таксама сувязным партызанскага атрада быў у часы Вялікай Айчыннай вайны В.Таўлай. **14.** Лічылі: калі на Вадохрышча на небе ... — то і ў засеках будзе ... (прыкм.). **15.** Лакафарбавы матэрыял. **18.** Найстарэйшая на Беларусі газета, у якой В.Таўлай працаваў у 1930 — 1932 гадах. **21.** «Успомні, дзяўчына, вясну і каханне,\\І ..., і жыта, і сад». З верша «Ты ведаеш, розна бывае ў змаганні». **25.** ... бушуе — вясну чуе (прыкм.). **26.** «На маёй дарозе — толькі снег,\\Над маёй дарогай — толькі ...». З верша Л.Рублеўскай «Валянцін Таўлай». **27.** Падарунак. **28.** Танцавальны крок. **29.** Рэдкае жаночае імя.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Сэрыі. 3. Пенна. 6. Вясна. 10. Гранада. 12. Атрад. 13. Мадыя. 16. Рані. 17. Мова. 19. Пост. 20. Ліда. 22. Яліна. 23. Жыліе. 24. Свабода. 30. Агата. 31. Ларер. 32. Шпакі.

Па вертыкалі: 1. Сцэрці. 3. Пэсня. 6. Вясна. 10. Чыста. 15. Эмаль. 18. «Звязда». 21. Расавецкік. 25. Вор. 26. Бог. 27. Дар. 28. Па. 29. Ік.

■ Спорт-тайм

ПАД ЗНАКАМ ЧОРНАЙ ПАЛАСЫ...

У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» пакінула за дужкамі медальныя разборкі ў Сочы і прыгадала, як на мінулым тыдні выступалі прадстаўнікі гульнявых відаў спорту.

1 **Беларускія хакеісты** бясслаўна вяртаюцца дадому з **міжнароднага турніру ў Гданьску**. У падапечных Глена Хэнлана атрымалася зарабіць толькі тры ачкі дзякуючы перамозе над венграмі. А затым беларуская дружына ўпершыню ў сваёй гісторыі саступіла італьянцам і палякам, якія, дарэчы, выступаюць у трэцім дывізіёне сусветнага хакея. Прычым паражэнне ад заходніх суседзяў бянтэжыць: да трэцяга перыяду наша зборная вяла 2:0, але за апошнія 20 хвілін прапусціла ажно чатыры шайбы. У выніку беларусы, якія да старту матчаў Еўрачэлэнджа лічыліся безумоўнымі фаварытамі, занялі толькі трэцяе месца. Тым не менш галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Глен Хэнлан не спяшаецца падымаць трывогу: «На турніры мы паляпшалі сваю гульню ад матча да матча, і першыя два перыяды з палякамі былі найлепшымі ў Гданьску. А потым сапернікі сталі дзейнічаць больш актыўна... Гэтая перамога для іх была больш цэннай. Безумоўна, я незадаволены не самай якаснай гульнёй сваіх хлопцаў, але гэты вынік не прымушае мяне панікаваць адносна перспектыў зборнай на хатнім чэмпіянаце свету. Зразумела, што ў Мінску стаўка будзе рабіцца на іншых хакеістаў. А многія з тых, хто выступаў у Польшчы, былі запрошаны для перспектывы: іх час прыйдзе праз два-тры гады.

Глену Хэнлану будзе над чым падумаць напярэдадні хатняга чэмпіянату свету па хакеі.

І вось адносна гэтай перспектывы сапраўды ёсць над чым задумацца і за што турбавацца».

2 У восьмым туры гандбольнай **Лігі чэмпіёнаў мінскае «Дынама»** на выездзе сустракалася з македонскім «Варадарам». На жаль, падапечныя Барыса Дзеніча саступілі балканцам з лікам 22:30 і страцілі ўсе шанцы на выхад у плэй-оф. Між іншым, настаўнік «бела-сініх» адзначыў, што ў яго гандбалістаў былі відавочныя праблемы з рэалізацыяй, а таксама паскардзіўся на судзейства. «На нашых атаках рэферы надта хутка падымалі рукі, сігналізуючы аб пасіўнай гульні. Разам з тым, гандбалісты «Вардара» маглі атакаваць ледзьве не па цэлай хвіліне. У такой сітуацыі, калі каманда вымушана атакаваць вельмі хутка і шмат часу праводзіць у абароне, рытм гульні істотна запавольваецца і гэта выклікае праблемы», — рэзюмаваў Барыс Дзеніч. У нядзелю «Дынама» згуляе з македонскім «Металургам». Ужо на нашай тэрыторыі....

3 Рубеж плэй-оф не скарыўся і **беларускім тэнісісткам**. У матчах першай Еўра-Афрыканскай зоны **Кубка федэрацыі** нашы спартсменкі атрымалі тры ўпэўненыя перамогі — над турчанкамі, партугалкамі і балгаркамі, з дзевяці сустрэч саступіўшы толькі адну парную! Але ў матчы за выхад у плэй-оф другой Сусветнай групы прайгралі прадстаўніцам Галандыі. Спачатку Аляксандра Сасновіч саступіла Рышэль Хагенкамп, а затым Вольга Гаварцова не здолела перамагчы Кікі Бертэнс. У наступным сезоне беларускія тэнісісткі зноў пачнуць матчы Кубка федэрацыі з першай Еўра-Афрыканскай зоны.

4 Не склаўся вырашальны матч і для **Віктарыі Паўловіч**. У **фінале Кубка Еўропы па настольным тэнісе** беларуска ў шасці напружаных партыях саступіла аўстрыйскай спартсменцы кітайскага паходжання Лю Цзя.

Няма спорту без паражэнняў. Будзем спадзявацца, што сваю чорную паласу беларускія спартсмены ўжо прайшлі і наперадзе нас чакаюць толькі прыемныя навіны.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

Даты | Падзеі | Людзі

1761 год — у гэты дзень карэтнік Міхаэль Каслер здзейсніў невялікае — усяго два кіламетры — падарожжа з роднага Браўнсдорфа (што ў акрузе Магдэбург) да суседняга Браўсберда. Але менавіта дзякуючы гэтаму падарожжу ён назаўжды ўпісаў сваё імя ў гісторыю. Бо важны быў не маршрут і не яго даўжыня, а тое, якім чынам ён падарожнічаў. А рабіў ён гэта на ровары — першым ровары, ім жа самім і вынайдзеным. Машына Каслера ўяўляла сабой два абітыя сталёвымі абручамі драўляныя колы, якія злучаліся зэдлікам для сядзення. Паводле легенды, вынаходнікам карэтнік з Браўнсдорфа стаў, што называецца, сам таго не хочучы. Аднойчы ён спазніўся на працу, і гаспадар сказаў яму: «Гэй, хлопец, прымайстраваць бы да тваіх ног колы!» Як бачым, Каслер успрыняў заўвагу сур'ёзна...

1945 год — завяршылася Крымская (Ялцінская) канферэнцыя «вялікай тройкі» — Сталіна, Рузвельта і Чэрчыля, на якой былі ўзгоднены планы канчатковага разгрому фашысцкай Германіі і маючай адбыцца безумоўнай капітуляцыі.

1949 год — нарадзілася (г. Адэса, Украіна) вядомы беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук (1996), прафесар (1998) Тацяна Паплаўская. Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1971) і працуе ў ім з 1976 г. Загадчык кафедры маўленнезнаўства і тэорыі камунікацыі (1996). Спецыяліст у галіне фаналогіі, камунікатыўнай і функцыянальнай лінгвістыкі. Аўтар манаграфій «Параўнальная тыпалогія беларускай і англійскай моў» (1983, у суаўтарстве), «Сегментарная фанетыка і прасодыя вуснага маўлення» (1993), «Маўленчы рытм у сінхраніі і дыяхраніі» (1995), вучэбнага дапаможніка для студэнтаў «Чытай і абмяркоўвай» (2012) і інш.

Было сказана

Леў ТАЛСТОЙ, вялікі рускі пісьменнік: *У лёсу няма выпадковасцяў; чалавек, хутчэй, стварае, чым сустракае свой лёс.*

НАРОДЖАНЫЯ 10 лютага

Пастаянны пошук прызнання — іх сэнс жыцця. Большасці гэта ўдаецца, прычым без асаблівых намаганняў. Упэўненасць і паслядоўнасць, спакой і рашучасць заўсёды дапамагаюць ім. Яны глыбока закранаюць эмоцыі тых, хто побач, але самі рэдка перажываюць бурныя пачуцці. Яны выдатна ўсведамляюць адказнасць за блізкіх людзей, але не заўсёды памятаюць пра тое, што ім трэба спачуваць і дапамагаць. Народжаныя ў гэты дзень падвяргаюць сябе рызыцы быць усімі пазнанымі, але адзінокімі, таму ім неабходна навучыцца хаця б зрэдку адыходзіць у цень і не грэбаваць сябрамі.

НАРОДЖАНЫЯ 11 лютага

Свабода — вось асноўны сэнс існавання гэтых людзей. Яны імкнуцца змяніць жыццё вакол сябе, напоўніць яго сэнсам, дасягнуць пэўнага дабрабыту. На гэтым шляху яны рэдка памыляюцца і ўпарта ідуць наперад да канца. Трапляючы ў непрыемныя сітуацыі, хутка знаходзяць выйсце з іх. Народжаных у гэты дзень можна дакараць у эгаізме, таму што ў сваім імкненні да высокіх пазіцый яны здольны празмерна захапіцца і забыцца пра тых, хто побач. Ім неабходна развіваць у сабе пачуццё такту і дыпламатычнасць.

Сёння, у дзень народзінаў, з радасцю вітаем разумніцу і шчырую працаўніцу, дабрачынніцу, прыгажуню **Тамару Мікалаеўну КРУТАЛЕВІЧ** з Беразіно! Зычым здароўя і бадзёрасці, творчага даўгалецця, поспехаў, здзяйснення мар... Ніскі паклон вам за ўсё, што зрабілі і зробіце! **Землякі і сябры з Мінска.**

СЁННЯ

Месяц

Поўня 15 лютага.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.38	18.10	9.32
Віцебск	8.31	17.56	9.25
Магілёў	8.28	18.00	9.32
Гомель	8.20	18.01	9.41
Гродна	8.52	18.26	9.34
Брэст	8.48	18.31	9.43

Імяніны

Пр. *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Лукі, Рамана, Якава.*
К. *Бажэны, Брыгіты, Марыі, Альгерда, Люцыяна, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+4..+6°С	КІЕЎ	+4..+6°С	РЫГА	+2..+4°С
ВІЛЬНЮС	+3..+5°С	МАСКВА	0..+2°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	0..+2°С

УСМІХНЕМСЯ

У дзіцячым садку кемлівыя выхавальніцы ў ціхі час прыдумалі конкурс для дзяцей: хто першы засне, таму можна не спаць!..

Баба з дзедам вельмі любілі гуляць у хованкі. Раніцай баба хавала самагон, а калі дзед яго знаходзіў, то ўвечары ўжо хавалася баба.

— Доктар, дапамажыце! Маёй жонцы ўжо 40, а яна ўсё яшчэ не можа пасталець... Я прымаю ванну, а яна топіць маіх качачак...

У кавярні.

— Фуа-гра, труфелі і «Шарданэ» 1947-га года.

— Няма.

— Тады сасіску ў цесце і піражок з бульбай.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.925. Індэкс 63850. Зак. № 655.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 лютага 2014 года.